№ 42 СЯЛЯНСКАЯ БІБЛІОТЭКА № 42

Аграном Уліцін

СУД НАД ТРОХПАЛЁЎКАЙ

...ЛАРУСКАЕ ... ШКОЛЫ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

МЕНСК—1925

№ 42 СЯЛЯНСКАЯ БІБЛІОТЭКА № 42

УЛІЦІН

СУД
НАД ТРОХПАЛЁЎКАЙ

Агро-п'еса ў I дзеі

ТАВАРЫСТВА ...АРУСКАЕ ШКОЛЫ
...ОЎНАЯ УПРАВА М. ВІЛЬНЯ

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
МЕНСК—1925

Б. Д. В. № 929 Галоўліт № 8228
2-я Дзярж. друкарня ДВБ. Зак № 929 У ліку 10.000 экз.

Суд над трохпалёўкай.

Агро-п'еса ў I дзеі.

Антось Высокалітоўскі—Старшыня суду.

Ігнась Лубіновіч, Сымон Сэрадэленка, Янка Бульба, Мікалай Тамасоўка — Сябры суду

Кастусь Лісахвост—Сакратар суду.

Уладзік Гаварушка—Абаронца.

Вінцусь Супаратар—Прокурор.

Максім Крывёнак—Агроном-экспэрт.

Якуб Гарэлы—Сьведка, трохпалёўнік, селянін вёскі Галадухі.

Сьцяпан Нядоля—Сьведка, трохпалёўнік, селянін вёскі Неслаўкі, 45 год. Абодва сьведкі худыя, у парванай вопратцы, з пустымі снапамі жыта, аўсу ды іншых расьлін.

Юрка Ўраджай—Сьведка, шматпалёўнік, селянін з вёскі Весялухі, 45 г.

Язэп Бурак—Сьведка, шматпалёўнік, селянін з вёскі Барсукі 35 г. Абодва сьведкі сытыя, давольныя, у добрай вопратцы, у ботах, сьмелыя, з добрымі вялікімі снапамі жыта, аўсу, канюшыны ды інш.

Якім Стрэльба, Васіль Сідарчук — Канвойныя, па 20 год.

Рыгор Попел—Судзебны выканаўца.

Падсудная Трохпалёўка—старая, слабая кабета, з сівыміваласамі, у лапцёх, з доўгім кіем.

Сцэна прадстаўляе вялікі пакой, на сцэне стол, пакрыты чырвонай матэрыяй, крэсла для старшыні і сяброў суду. Два столікі для абвінавальніка і абаронцы лава для сьведкаў і асобна, каля месца абаронцы, лава для падсуднай. На сьценах партрэты правадыроў. Пры адчыненьні заслоны на сцэне ўсе ўдзельнікі процэсу, апроч старшыні і сяброў суду, падсуднай і канвою.

Судовы выканаўца *(да публікі)*. Грамадзяне, прашу заняць месцы; прашу зьняць галаўныя ўборы. Прашу ўстаць,—суд ідзе.

Уваходзіць старшыня і сябры суду.

Старшыня суду. Пасяджэньне агрономічнага грамадзянскага суду БССР абвяшчаю адчыненым. Прашу сесьці. *(Да судовага выканаўцы)*. Прывядзеце падсудную.

(Два канвойнык з голымі шаблямі ўводзяць падсудную Трохпалёўку. Яна садзіцца на лаву для падсудных. Конвойныя застаюцца каля яе).

Старшыня. Слухаецца справа па абвінавачаньні Савецкім урадам грамадзянкі Трохпалёўкі, якая на працягу блізка каля 400 год шкодзіла сельскай гаспадарцы і ўчыніла шмат іншых злачынстваў.

Абвінавальнік, прадстаўнік Савецкага ўраду Супаратар Вінцусь, ёсьць?

Прокурор. Тут.

Старшыня. Абвінавачаная Трохпалёўка Беларуская ёсьць?

Трохпалёўка. Ёсьць.

Старшыня. Сьведка Якуб Гарэлы, селянін вёскі Галадухі, трохпалёўнік, ёсьць?

Гарэлы. Тут.

Старшыня. Сьведка Нядоля Сьцяпан, селянін вёскі Няелаўкі, трохпалёўнік, ёсьць?

Нядоля. Тут.

Старшыня. Сьведка, шматпалёўнік, селянін вёскі Весялухі, Ураджай Юрка, ёсьць?

Ураджай. Тут.

Старшыня. Сьведка, шматпалёўнік, селянін вёскі Барсукі, Бурак Язэп, ёсьць?

Бурак. Ёсьць.

Старшыня. Агроном Крывёнак ёсьць?

Крывёнак. Тут.

Старшыня. Абаронца падсуднай, Гаварушка, ёсьць?

Гаварушка. Ёсьць.

Старшыня. Усіх сьведкаў па гэтай справе прашу выйсьці ў асобны пакой і не заходзіць да салі суду пакуль ня выклікаюць. *(Сьведкі выходзяць).*

Старшыня. Акалічнасьці гэтае справы такія. *(Чытае).* Скінуўшы ярмо царскага і панскага прыгнечаньня і перадаўшы ўсю зямлю працуючым, Савецкая ўлада, у сваіх клопатах аб дабрабыце жыхарства, зьвярнула асаблівую ўвагу на вясковую гаспадарку, як на асноўную крыніцу існаваньня ўсёй дзяржавы. Пры гэтым знойдзена, што сельская гаспадарка нават пры спагадных умовах клімату і глебы прышла да заняпаду. Сярэднія ўраджаі хлеба бываюць 40-45 пудоў з дзесяціны; сена—70-80 пудоў з дзесяціны; гадавы ўдой кароў—50-60 вядзёр з аднае жывёлы. Апроч такіх нізкіх ураджаяў, за апошнія гады сталі зьяўляцца на палёх шкадлівыя казюлькі, якія нішчаць ураджаі, яшчэ больш павялічваюць голад, мор, пошасьці. Для дакладнага высьвятленьня прычын гэтага няшчасьця нашае сельскае гаспадаркі былі заклікаы спэцыялістыя агрономы, якія і вызначылі, што ў заняпадзе сельскае гаспадаркі вінавата Трохпалёўка Беларуская, якая мае блізка 400 год ад роду, пры царызьме не абвінавачвалася, да суду прыцягнута ня была, зьявілася на Беларусі і распачала сваю шкадлівую чыннасьць. Карыстаючыся цемнатой народу, бяскарнасьцю, злачынствам, яна за гэты час разбурыла сельскую гаспадарку Беларусі, давяла яе да заняпаду,

што, з другога боку, дапамагло заняпаду іншых галін народнае гаспадаркі. У зьвязку з гэтымі злачынствамі грамадзянкі Трохпалёўкі зьявілася беспрацоўе, голад, пошасьці з тысячамі ахвяр. Усе сельскія гаспадары прымушаны вясьці вельмі цяжкае поўгалоднае жыцьцё. Дзеля гэтага грамадзянцы Трохпалёўцы прад'яўляюцца наступныя абвінавачваньні:

1. Пры агульным малазямельлі і пры вялікім ліку безьзямельных сялян, грамадзянка Трохпалёўка заўсёды трымала пад парам $^1/_3$ частку зямлі замест $^1/_6$-$^1/_8$, ад чаго зьменшылася плошча скарыстанай зямлі.

2. Трохпалёўка, сеючы аднасямейныя расьліны, больш збожжа (жыта, аўсу, проса ды інш.) аднабакова высіляла глебу і перашкаджала правільна выкарыстаць як дадзенае ўгнаеньне, так і прыродную пладавітасьць глебы.

3. Трохпалёўка засьмечвала зямлю некарыснымі і шкадлівымі травамі, якія зьяўляюцца злымі ворагамі сельскай гаспадаркі.

4. Трохпалёўка разьвяла шмат шкадлівых казюлек, якія месцамі зьнішчаюць увесь ураджай.

5. Трохпалёўка кепскай апрацоўкай глебы, аддаючы на папас зямлю ў папары, псавала прыродную ўласьцівасьць глебы, робячы яе глыбакаватай і парахняватай, што вельмі кепска для ўзросту расьлін і для ўраджаяў.

6. Трохпалёўка, не дапушчаючы на поле пасеву кармовай травы і караньплодаў, паставіла жывёлагадоўлю на Беларусі ў дрэнныя варункі разьвіцьця, ад чаго жывёла зрабілася дробнай і ўдой панізіўся, паменшылася гною.

7. Трохпалёўка, затрымліваючы разьвіцьцё сельскае гаспадаркі і сельскае коопэрацыі, стварыла беспрацоўе, голад і тым самым зрабіла вялікую небясьпеку заваяваньням Кастрычнікавае рэволюцыі, дзеля гэтага грамадзянка Трохпалёўка Беларуская абвінавачваецца па 101, 182 і 245 ст. КК і прыцягваецца да суду.

Грамадзянка Трохпалёўка, ці прызнаеце сябе вінаватай у пералічаных злачынствах?

Т р о х п а л ё ў к а. Гр. судзьдзя. Я старая і глухая, я мала зразумела ў чым мяне абвінавачваеце.

С т а р ш ы н я *(моцна)*. Вы абвінавачваецеся ў тым, што на працягу блізка 400 год вы псавалі і высілялі зямлю, трымалі трэцюю частку яе пад папарам, калі яе можна было выкарыстаць, пасеяўшы траву. Вы не дазвалялі рана араць папар, чым перашкаджалі барацьбе з траўем і недародам. Засьмецілі зямлю зельлем, распладзілі шмат шкадлівых казюлек. Не дазваляючы пасеву кармовай травы на палёх, вы прымусілі сялянскую жывёлу галадаваць і не даваць даходу ў гаспадарцы. Вы затрымалі разьвіцьцё коопэрацыі на вёсцы. Такім чынам, вы абвінавачваецеся ўва ўсіх ліхах, якія ёсьць у нашай сельскай гаспадарцы і якія пагражаюць еднасьці дзяржавы і заваяваньням Кастрычнікавае рэволюцыі. Вось у чым вы абвінавачваецеся. Ці чулі цяпер, ці зразумелі?

Т р о х п а л ё ў к а *(кашляе і чэша галаву)*. Цяпер зразумела.

С т а р ш ы н я. Ці прызнаецеся ў гэтай віне і гэтых злачынствах?

Т р о х п а л ё ў к а. Не, не прызнаюся. Праўда, у мяне $^1/_3$ зямлі знаходзіцца пад папарам. Але-ж зямля бяз гною павінна адпачыць два гады, а ня 5-8 год, як гэта кажаце вы.

С т а р ш ы н я. Абвінавачаная Трохпалёўка, вы сказалі, што зямля павінна адпачываць і ўгнойвацца. Які-ж вы давалі ёй адпачынак, калі жывёлы яе таптaлі, распыльвалі і ўгнетвалі. Замест адпачынку яна высыхала і высільвалася ад шкодных траў.

Т р о х п а л ё ў к а. Жывёлы зямлі ня шкодзяць, ды тут яны павінны пасьціцца. У сялян лішняе зямлі няма, ні выганаў, ні лесу.

С т а р ш ы н я. Вы прызнаеце, што ў сельскіх гаспадароў зямлі вельмі мала, а тымчасам трымалі $^1/_3$

яе пад папарам. Ці-ж гэта выгодна, бо на Беларусі каля 2.000.000 дзесяцін не дае карысьці.

Т р о х п а л ё ў к а. Я, таварыш судзьдзя, старая і няпісьменная і лічыць ня ўмею.

С т а р ш ы н я Падсудная, можа вы растлумачыце, чаму вы не дазвалялі ў вашым севазвароце такой выгоднай травы, як кармовая і кораньплоды, што шкодзіла сялянскай жывёлагадоўлі. Штогодным пасевам адзінокімі расьлінамі вы высілілі і засьмяцілі зямлю некарысным траўем і разьвялі шкодныя казюлькі і чарвякоў.

Т р о х п а л ё ў к а. Грамадзяне судзьдзі, я старая, я распачала гаспадарыць каля 400 год назад. Тады людзей было мала, сенажацяй даволі і патрэбы ў пасеве травы ня было. А цяпер, як траву можна сеяць на полі, калі селяніну і хлеба недзе сеяць? Дзе нам аб жывёлах думаць, калі часта самім есьці нечага. Аб засьмечваньні палёў травамі ды аб казюльках ды жуках, ды чарвяках я нічога сказаць не магу: яны створаны богам і ўсе хваробы, галадоўкі, гэта такса ад бога; калі ён не пашле дажджу ды зямелька будзе дрэнная, тады ніякія агрономы ня здолеюць дапамагчы.

С т а р ш ы н я. Сядайце падсудная. *(Да судовых выканаўцы)*. Папрасеце сьведку Гарэлага Якуба з яго даказамі. *(Уваходзіць сьведка Гарэлы ў парваных лапцёх і парванай вопратцы, худы, ледзь ходзіць. Нясе малы пусты сноп жыта, засьмечаны некарыснымі травамі і торбачкі з засьмечаным зельлем-насеньнем).*

С т а р ш ы н я. Сьведка Гарэлы, вы павінны даць суду ўрачыстае абяцаньне казаць толькі праўду. За няпраўдзівыя паказаньні вы будзеце прыцягнены да адказнасьці па закону. Падпішэце ўрачыстае абяцаньне. *(Дае для подпісу паперу)*.

Г а р э л ы. Я няпісьменны.

С т а р ш ы н я. Калі вы няпісьменны, тады пастаўце тут тры крыжы. *(Гарэлы бярэ няўмела пяро і дрыжачай рукой ставіць крыжы)*. Скажэце, сьведка, што вы

ведаеце ў гэтай справе. Паведайце суду, як вядзецца ў вас гаспадарка, які прыбытак ад яе маеце.

Гарэлы. Ох, грамадзяне судзьдзі, гаротнае нашае жыцьцё: працуеш, працуеш, а як прыдзе зіма, дык і да каляд хлеба не хапае, ходзіш па суседзях ды просіш; а тут яшчэ падатак вымагаюць; праўда-ж, мы павінны дапамагчы дзяржаве і падатку ўсяго з мяне 10 рублёў, але скуль-жа яго ўзяць. Добра, калі бог пашле ўраджаю, а калі вымакне, выпрае або жукі зьядуць,—дык магіла.

Старшыня. Скажэце, сьведка, колькі ў вас зямлі, колькі душ сям'і і скаціны.

Гарэлы. Зямелькі—6 дзесяцін, сям'і—6 душ, жывёлы—кароўка, конь, парасё і дзьве авечкі.

Старшыня. Які вядзіцё севазварот?

Гарэлы. Які там севабарот? Адзін ён ў нас—трохпалёвы, іншага і ня ведаем. Бацькі і дзяды нашы так жылі й працавалі, за імі і мы працуем. Замучыла нас гэта трохпалёўка—і для сябе нядобра, а для жывёлы зусім кепска.

Старшыня. Які ўраджай у вас?

Гарэлы. Ураджаі мае вельмі кепскія. Жыта, напрыклад, у добрыя гады дае 35-40 пуд. Аўсу—30-35 пуд. Вось паглядзеце. *(Паказвае суду свае снапы)*. Ячмень, дык не зварачае нават насеньня. Толькі бульба дапамагае, дый то, калі даць ёй угнаеньне.

Старшыня. Калі ласка, скажэце сьведка, вы ніколі не падлічвалі на грошы, колькі вы зарабляеце сваім ураджаем?

Гарэлы. Калісь лічыў. Разам з саломай набярэцца на 106 рублёў. На гэтыя грошы павінен я жыць з сям'ёй і карміць жывёлу, дый падатак плаціць.

Старшыня *(пытае сяброў суду)*. Ці ня маеце запытаньня?

Лубіновіч. Скажэце, сьведка, вашы суседзі з такім самым трохпалёвым севазваротам?

Гарэлы *(махае рукой)*. Якое там жыцьцё! Таксама жывуць, як і я—з хлеба на квас перабіваюцца Прашоў дзень і хвала богу.

Сэрадэленка. Скажэце, сьведка, ці ваша кароўка дае многа малака?

Гарэлы. Карысьці ад каровы няма ніякай. Малака яна дае вельмі мала, улетку хапае толькі забяліць страву. Як яна можа даваць малака, калі ўвесну яе прыходзіцца за хвост цягнуць на пашу.

Абаронца. Прашу суд дазволіць запытаць сьведку.

Старшыня. Калі ласка.

Абаронца Скажэце, сьведка, ці вядома вам, хто такі агроном, ці блізка ад вашай вёскі школа, крэдытнае таварыства і ці ня чулі вы, што ёсьць шматпалёвы севазварот з падсевам карыснай травы.

Гарэлы. Пра агронома нічога ня чуў. Каля нашае вёскі ні школы, ні таварыства ніколі ня было. Пра шматпольле ня ведаю. Вось аб траве калісь чуў.

Абаронца. Ад каго-ж вы чулі пра траву і якая гэта трава?

Гарэлы. Кум Язэп калісь гаварыў, што ён чуў ад свайго свата Ціхана, а Ціхану апавядала бабка Марэшчыха, што яна ведае траву, якая дапамагае хворай жывёле.

Прокурор. Прашу дазволіць запытаць сьведку.

Старшыня. Прашу.

Прокурор. Скажэце, сьведка, колькі год вы гаспадарыце, якія былі ў вас ураджаі раней, 10-15 год назад, і якія цяпер? Ці не дазналіся, хто вінаваты ў вашай бядзе і ці ёсьць у вашай вёсцы Галадусе такія, што жывуць лепш за вас?

Гарэлы. Гаспадаром я ўжо 30 год і прымячаю, што з кожным годам ураджаі становяцца горш ды горш. Раней я зьбіраў жыта і 100 і 90 пуд. з дзесяціны, а цяпер гадоў 3-5 ня больш як 50,—то вымакне, то шкадлівае траўе заглушыць, а то і чарвякі зьядуць; калі гэтак і далей будзе, дык усе загінем. У вёсцы Галадусе я ня ведаю аніводнага чалавека, у якога хапіла-б хлеба да каляд. Хто вінен у нашай бядзе—ня ведаю.

Старшыня. Скажэце, сьведка, ці не прабавалі вы як палепшыць сваю гаспадарку, ды павялічыць вашы ўраджаі?

Гарэлы. Як не прабаваць, як не клапаціцца. Клапоцімся і прабуем. Штогод прывозім айца Івана з дзякам; яны абходзяць усё поле, кропяць сьвянцонай вадой, служаць малебства,—але нічога не памагае. Прагнявілі, відаць, мы бога.

Старшыня. Больш пытаньняў да сьведкі няма?

Староны. Няма.

Старшыня. Сядайце, сьведка. *(Гарэлы садзіцца на лаву).* Таварыш Судовы выканаўца, папрасеце сьведку, Нядолю. *(Судовы выканаўца выходзіць і прыводзіць Нядолю; ён худы, вельмі кепска ўбраны чалавек. Нядоля нясе сноп кепскага жыта й аўсу і торбачку засьмечанага насеньня).*

Старшыня. Сьведка Нядоля, даіцё вы суду ўрачыстае абяцаньне гаварыць толькі праўду? За няпраўдзівыя паказаньні вы будзеце прыцягнуты да адказнасьці па закону. Падпішэце расьпіску ўрачыстага абяцаньня.

Нядоля. Я няпісьменны, тав. судзьдзя.

Старшыня. Тады пастаўце вось тут тры крыжы. *(Нядоля ставіць вельмі няўмела крыжы).* Цяпер, сьведка, скажэце суду, ці добра вы жывіцё, што для вас патрэбна, як вядзецца ў вас гаспадарка, колькі ў вас зямлі, колькі душ сям'і і колькі скаціны?

Нядоля. Зямлі ў мяне 4 дзесяціны, сям'і—пяць душ; жывёлы: конь, кароўка, парасё, дзьве авечкі і пяць курэй. Жыцьцё маё, грамадзяне судзьдзі, вельмі цяжкое. Дзень і ноч улетку і ўзімку працую, а свайго хлеба хапае толькі да каляд, а там ходзіш прасіць да суседзяў. Жыхары вёскі нашай—такая-ж беднота, як і я, але-ж што могуць, то й даюць. Так да вясны з скацінай чуць дажывеш. Падатку плаціць нечым. Ды што? Ня жыву, а бядую!

Старшыня. Скажэце, сьведка, які севазварот вядзіцё вы і ваша вёска?

Н я д о л я. Себарот?.. Пра гэта нічога ня чуў, ніколі яго ня бачыў.

С т а р ш ы н я. Севазварот—гэта ёсьць лік палёў на вашай зямлі і парадак, у якім на кожным полі засяваецца хлеб, скажам: папар, жыта, авёс, потым зноў папар.

Н я д о л я. Цяпер зразумеў. Палёў у мяне тры, а палос—10. Поле пад папарам, затым жыта, потым ярына. Так дзяды і бацькі працавалі, так і я працую.

С т а р ш ы н я. Значыцца, севазварот у вас трохпалёвы.

Н я д о л я. Ну, значыцца, трохпалёвы.

С т а р ш ы н я. Цяпер скажэце, які ў вас інвэнтар?

Н я д о л я. Анвэртар?.. Ніколі ня чуў пра яго і ня ведаю, што гэта.

С т а р ш ы н я. Інвэнтар—гэта прыладзьдзі, якія ўжываюцца для апрацоўкі зямлі. Гэта—машыны.

Н я д о л я. Ага, разумею. У мяне ёсьць плуг—нядаўна купіў, драўляная барана, і больш нічога ня маю.

С т а р ш ы н я. Скажэце, сьведка, ці даўно вы купілі плуг, дзе і як яго купілі.

Н я д о л я. А гэта было гады чатыры назад; прыходзіць да мяне сват Максім і кажа: „Пойдзем да кума Ігнася, ён нейкі плужок купіў. Пойдзем паглядзім, кажуць людзі, вельмі добра арэ гэты плужок“. Мы яшчэ пасьмяяліся, што дарма ён грошы загубіў, бо на нашай зямлі найлепшая—гэта саха. Пашлі ў поле, глядзім, а тут і кум з плугам едзе. Сялян шмат сабралася, усе абступілі кума, усім цікава пагдядзець, як ён будзе араць. Зьняў кум гэты плуг, зачапіў за канец ворчык, запрог каня і пашоў. Тут мы ўсе пачалі дзівіцца: конь ідзе лёгка, а плуг, як добры грэбень, чэша зямлю глыбока, ды так добра забірае ўсё траўе пад сябе, што і ня відаць зусім. Спыталіся мы ў Ігнася, дзе ён купіў гэтую штуку, ды назаўтра ўсе да гораду, у акруговы аддзел земляробства. Там і купілі плугоў. Цяпер у нашай вёсцы ўсе аруць гэтымі плугамі.

Старшыня. Скажэце, сьведка, колькі ў вас зямлі пад папарам і як вы яе апрацоўваеце?

Нядоля. Ведама, колькі пад папарам—трэцяя частка, як патрэбна. Апрацоўваю яе я гэтак: прааpу адзін раз яе плугам, а потым праз тыдні два забараную, перад тым, як сеяць.

Старшыня. Калі вы арыцё папар?

Нядоля. Ару, як звычайна, так... у чэрвені. Раней гэта рабіць нельга, бо там ходзіць жывёла, а выганаў у нас няма. Так бацькі рабілі, так і я раблю.

Старшыня. Колькі гною ў вас бывае?

Нядоля *(чэша за вухам)*. Які там гной. Так вазоў 20 бывае; вось і ўсё.

Старшыня. Скажэце, сьведка, колькі хлеба вы зьбіраеце і які ў вас ураджай?

Нядоля. Ураджаі мае зусім кепскія. Зямелька дрэнная і амаль што нічога ня родзіць. На дзесяціну жыта зьбіраю пудоў 35, аўсу—30, лёну—12, грэчкі—15 пудоў. З ўсяе мае зямлі зьбіраю хлеба 70 пудоў, бульбы—120 пуд., яравых—50 пуд. і сена—10 пудоў. З гэтага патрэбна накарміць сям'ю, скаціну і падаткі заплаціць. Вось тут і жыві, як хочаш.

Старшыня. Ці не прабавалі сяляне вашай вёскі што-небудзь зрабіць, каб павялічыць ваш ураджай?

Нядоля. Як не прабавалі? Клапаціліся: штогод на Міколу ўсё молімся, айца Якуба з дыяканам на поле прывозім, малебны служым, з абразамі па полі ходзім. Нічога не памагае. Толькі дарэмны расход. Разгневаўся на нас бог, ох, як разгневаўся!

Старшыня. Скажэце, сьведка Нядоля, ці быў у вас на вёсцы агроном?

Нядоля. Агроном? не, ніколі пра яго ня чуў. Хто гэта такі?

Старшыня. Гэта адукаваны чалавек, які ведае, як трэба апрацоўваць глебу так, каб яна давала ўраджаю 150 пуд. з дзесяціны.

Н я д о л я. Дык гэта агроном. Не, нам у нашай вёсцы ён не патрэбны,—ён нам дапамагчы ня можа. *(Махае рукой).* Калі зямля кепская, які тады агроном дапаможа. Нам у Неслаўцы калі-б зямлі больш было, ды падаткаў менш, дык і добра было-б. Агроном нам не патрэбны. *(Махае рукой).*

С т а р ш ы н я. Ніхто ня мае пытаньняў да сьведкі?

Л у б і н о в і ч. Скажэце, сьведка, як жывуць вашыя сяляне ў Неслаўцы, ці многа гадуюць жывёлы?

Н я д о л я. Жывуць голыя, босыя і галодныя, за гэта і вёску нашу завуць Неслаўкай. Усё ліха нашае, што няма корму і ня ведаем, як яго адшукаць. Вось і выходзіць, што няма ні скаціны, ні гною, ні хлеба. Жыві, як хочаш *(чэша за вухам)*, ды яшчэ і падаткі плаці.

С э р а д э л е н к а. Скажэце, сьведка, ці ня ведаеце вы такіх гаспадароў, якія на чатырох дзесяцінах жывуць добра, гадуюць 3-4 кароўкі і праводзяць севазварот не трохпалёвы, а шматпалёвы з засевам траў і караньплодаў.

Н я д о л я. Такіх гаспадароў, каб на 4 дзесяціны добра жылі, у нас, у Неслаўцы, няма. *(Сьмяецца).* Гэта немагчыма, каб на 4 дзесяцінах гадаваць 3-4 каровы. Як можна сеяць траву ды караньплоды, калі для хлеба не хапае месца ў полі.

С т а р ш ы н я. Запытаньняў да сьведкі няма больш?

П р о к у р о р. Дазвольце.

С т а р ш ы н я. Прашу.

П р о к у р о р. Скажэце, сьведка, ці акуратна плаціце вы і вашы сяляне з Неслаўкі падатак?

Н я д о л я. Падатак хоць з нас бяруць і невялікі— усяго 9 руб. 40 кап., але і яго плаціць няма чым. Калі быў-бы корм, тады гадаваў-бы якогась бычка ўлетку, прадаў-бы, дык і сабе грошы былі-б і падатак заплаціў-бы. А цяпер, калі не запрацую дзе-небудзь, дык гора.

С т а р ш ы н я. Больш пытаньняў няма?

У с е адказваюць, што няма.

Старшыня. Сядайце, сьведка. Тав. судовы выканаўца, папрасеце сьведку Ўраджая, шматпалёўніка, селяніна вёскі Весялухі, з яго даказамі. *(Судовы выканаўца прыводзіць сьведку Ўраджая, здаровага, у добрай вопратцы чалавека. Ён трымае высокі сноп хлебных расьлін выкі, канюшыны і торбачкі з чыстым і добрым насеньнем).* Сьведка Ўраджай, вы павінны даць суду ўрачыстае абяцаньне паказваць толькі праўду. За непраўдзівыя паказаньні вы будзеце пакараны па закону. Падпішэце расьпіску аб гэтым. *(Ураджай бярэ пяро і падпісвае паперу).* Скажэце сьведка колькі ў вас зямлі, які севазварот вядзіцё, які ўраджай у вашай гаспадарцы, колькі душ сям'і, колькі скаціны і як вы нагул жывіцё?

Ураджай. Зямлі маю 6 дзесяцін, зямля пескаватая. Раней я вёў трохпалёвы севазварот, а ўжо 15 год вяду васьміпалёвы. Ураджай мой вось які: жыта —пудоў 100 з дзесяціны, аўсу—пудоў 80, бульбы—пудоў 800, канюшыны—больш як 300 пудоў, вось глядзеце *(паказвае старшыні сноп).* Сям'і ў мяне шэсьць душ. Скаціны—конь, 4 каровы, 8 авечак, дзьве сьвіньні і 15 курэй. Уся зямля падзелена на 8 палёў: 1) папар, угноены пад азімай вікай; 2) жыта з падсевам сэрадэлі; 3) бульба, 4) ярына з канюшынай, 5) канюшына першага году; 6) канюшына 2-га году, 7) жыта з сэрадэляй; 8) яр,—гэта ў мяне $1^1/_2$ дзесяц. жыта, два палі,—адно поле па гноі, другое па канюшыне; два палі ярыны,—адно пасьля бульбы, другое пасьля жыта, два палі канюшыны, адно поле бульбы і адно папару. Зямлі малавата, але-ж жыву добра. Падаткі плачу ў тэрмін і застаецца даволі і для мяне.

Старшыня. Адкуль у вас, сьведка, столькі корму для 4 кароў з шасьці дзесяцін?

Ураджай. Вось адкуль: $1^1/_2$ дзес. канюшыны даюць 300 пуд. з дзес. — 450 пуд.; сэрадэля—$^3/_4$ дзес.— 100 пуд., бульбы—$^3/_4$ дзес. — 600., яравое саломы—200 пуд. і з надзелу сена—100 пуд. і яшчэ 400 пуд. бульбы апроч насеньня. Хапае для маёй скаціны.

П р о к у р о р. Прашу дазволіць запытацца сьведку.

С т а р ш ы н я. Дазваляю.

П р о к у р о р. Скажэце, сьведка, як вы жылі да пераходу на травапасеў і шматпольле?

У р а д ж а й. Да пераходу да травапасеву, грамадзяне судзьдзі, я ня жыў, а бедаваў. Ня было ні корму, ні гною, ні хлеба. Зямля амаль што зусім не радзіла. Мне з сям'ёй і скацінай даводзілася часта галадаваць. Адзін конь і адна кароўка ўвясну не маглі і ногі цягнуць. За нядоімкі цягаюць мяне, цягаюць, але бачаць, што ўзяць няма чаго, дык плюнуць і пойдуць. Калі я перашоў да шматпольля ды пачаў сеяць траву ды караньплоды, зараз корму павялічылася, завёў больш скаціны, пабольшала гною, вядома, і больш стала хлеба і цяпер, ведаеце, з тэй-жа зямлёй я буржуй. *(Съмяецца).*

П р о к у р о р. А як жывуць другія сяляне ў вашай вёсцы, якія перашлі на шматпольле?

У р а д ж а й. Жывуць і горш і лепш. Хто мае 3-4 дзесяціны, той гадуе 2-3 каровы; хто мае 6-7 дзесяцін—гадуе два кані ды 5-6 кароў; а наогул усе вельмі добра жывуць і дзякуюць таго, хто знашоў гэту канюшыну ды шматпалёвы севазварот.

А б а р о н ц а. Дазвольце мне запытацца ў сьведкі.

С т а р ш ы н я. Калі ласка.

А б а р о н ц а. Скажэце, сьведка, у вас асобнае пашы няма, дык дзе-ж вы пасьвіце сваіх кароў і як вы апрацоўваеце папар?

У р а д ж а й. Каб карміць маіх кароў, я ўвосень сею пасьля ярыны, дзе павінен быць папар, траву— азімую выку, зьмешаную з жытам. На дзесяціну бяру 6 пуд. выкі і $2^1/_2$ пуды жыта. Гэта я сею звычайна ў час азімага пасеву. У маі, у час недахвату корму, выка дае многа сьвежага, зялёнага корму. Зямля пасьля выкі рыхлая, мокрая і для адпачынку яе застаецца шмат часу, так што ўраджай амаль што не зьмяншаецца. Жывёла пасецца проста па гэтай выцы на прывязі. Пасьля выкі я кладу гной, вазоў 80 на $^3/_4$ дзесяціны. Жывёлу я прывязваю на вяроўцы такой даў-

жыні, каб карова наеласа і адпачыла. Яна зьесьць некалькі пудоў травы на месцы, а ня ходзіць многа вёрст за гэтай травой. Ад такога гадаваньня каровы даюць больш малака. Вось паглядзеце на азімую выку ў маі месяцы. *(Паказвае суду).* Гэта выка пэўны ратунак гаспадароў ад бяскорміцы ўвесну.

Абаронца. Паведайце, сьведка, як вы перашлі ад трохпалёўкі: вы самі дадумаліся ці хто вам параіў?

Ураджай. Гэта параіў мне агроном, які езьдзіў да нашае вёскі. Гэта ён сказаў кінуць праклятую трохпалёўку, тлумачачы, якую шкоду яна прыносіць і як карысна шматпольле ды травапасеў. Ён пачаў раздаваць насеньне на спробу ды зрабіў паказальнае поле. Вось тут я і перараканаўся, што шматпольле і травапасеў сапраўды выратуюць сялян ад жабрацтва і голаду.

Старшыня *(пытае сяброў суду).* Ніхто ня мае пытаньняў да сьведкі?

Райграс. Скажэце сьведка, які ваш даход быў, калі вы карысталіся трохпалёўкай і цяпер, калі вы перашлі на шматпольле?

Ураджай. Усяго я маю прыбытку з гаспадаркі так рублёў 600, а раней 110.

Тамасоўка. Адкуль бярэце вы гэткую суму?

Ураджай. Найвялікшую частку даходу я атрымліваю ад жывёлагадоўлі, каля 400 рублёў, і гэту галіну гаспадаркі лічу найкарыснай. Карова—гэта нейкая фабрыка, якая перарабляе вельмі танны корм у дарагія продукты—малако, масла, сыр, мяса...

Прокурор. Дазвольце запытаць сьведку.

Старшыня Запытайце.

Прокурор. Колькі падатку плацілі вы раней і колькі плаціце цяпер?

Ураджай. Раней, калі я вёў трохпалёвы севазварот, тады я плаціў 10 руб. 20 кап. дый гэта я не плаціў у тэрмін. Цяпер з мяне лічаць 22 р. 50 кап., але-ж я плачу толькі 7-8 рублёў, бо мне скідаюць за травапасеў, добрую апрацоўку зямлі, пасеў ачышчаным насеньнем...

Прокурор. А сяляне вашай вёскі—як яны з падаткам былі раней і цяпер?

Ураджай. У нашай вёсцы ўсе сяляне цяпер плацяць у два разы менш, як раней, бо ім таксама скідаюць за палепшаньне гаспадаркі; наогул, ніхто ня мае нядоімкі.

Старшыня. Вы сказалі, што галоўную частку прыбытку даюць вашы каровы. Колькі малака даюць вашы каровы?

Ураджай. Мае каровы даюць 150 вёдзер малака ў год, вось толькі прадаваць яго кепска. Вёска наша далёка ад гораду Менску і акругі Воршы[1]). Блізка няма ні фабрыкі, ні прадпрыемстваў. Проста бяда была. Але мы, сяляне, аб'ядналіся ў таварыства для вырабу масла. Нанялі хату, купілі машыну, сэпаратар завецца *(прокурор моршчыцца)*, якая аддзяляе сьмятанку ад малака.

Прокурор. Не сэпаратар, а цэнтрафуга.

Ураджай. Але, цэнтрафуга... Нанялі майстра, напісалі ўмову, на падставе якой мы павінны ўсё малако аддаваць у таварыства па 60 кап. за вядро. Штодня мы носім ня менш, як два вядры. Апрача таго, нам зварочваюць зьнятае малако, якім мы кормім цялят і квасім для тварагу. Кожны сябра таварыства, апрача платы за малако, мае ўдзел у прыбытках таварыства. Масла вялікімі партыямі адсылаем у Менск і Маскву, дзе яго купляюць у коопэрацыю ці ў вялікія і багатыя крамы. А раней *(сьмяецца)* ад аднэй кароўкі атрымлівалі нябольш 40 вёдзер малака,—і дзецям не хапала.

Старшыня. Больш пытаньняў да сьведкі ніхто ня мае?

Усе. Няма.

Старшыня. Сядайце, сьведка. *(Да судовага выканаўцы).* Папрасеце сьведку Бурака, шматпольніка. *(Уваходзіць Бурак, плячысты, сьмелы чалавек, на ім добрая вопратка, боты. Ён нясе вялікі сноп жыта, аў-*

[1]) Акруга называецца тая, у якой ставіцца п'еса.

су, выкі, канюшыны і інш.). Сьведка Бурак, вы павінны даць суду ўрачыстае абяцаньне гаварыць толькі праўду. За хлусьню вы будзеце пакараны па закону. Падпішэце абяцаньне. *(Бурак падпісвае).* Скажэце, сьведка, суду, як вы жылі да пераходу на шматпольле, як жывеце цяпер, колькі маеце зямлі, душ сям'і і якая ў вас зямля?

Бурак. Усяго зямлі ў мяне, грамадзяне судзьдзі, 4 дзесяціны. Гэта вельмі мала. Скаціны маю: 4 каровы, каня, 4 авечкі, сьвіньню, двое парасят і 10 курэй. Сям'я мая складаецца з 5 душ. Зямля кепская, бедная, пескаватая.

Старшыня. Якія прыладзьдзі вы маеце?

Бурак. З прыладзьдзяў ёсьць у мяне толькі адзін плуг, адна жалезная барана, але я лічуся сябрам машыннага таварыства, дык ад таварыства карыстаюся радковай сеялкай, культыватарам лапчатым, бараной для сенажаці, просадзёркай ды малатарняй.

Старшыня. Скажэце, сьведка, які севазварот вы вядзеце?

Бурак. Ужо дзесяць год вяду шасьціпольны севазварот: 1) папар, угноены пад азімае выкай; 2) жыта з падсевам сэрадэлі; 3) бульба; 4) ярына з канюшынай; 5 і 6—канюшына.

Старшыня. Які ўраджай у вас з вашай гаспадаркі ад розных расьлін?

Бурак. На ўраджай мой, грамадзяне судзьдзі, жаліцца я не магу. Як толькі я перашоў ад трохпалёўкі да шматпольля,—павялічылася ў мяне гною, пачаў я апрацоўваць добра зямлю, пачаліся і добрыя ўраджаі. Наогул, я маю з дзесяцін—жыта 115 пуд., аўсу 90 пуд., канюшыны 320 пуд., бульбы 900 пуд., проса 90 пуд. Грэчкі я ня сею, ня пэўная гэта расьліна.

Старшыня. Колькі хлеба маеце вы з сваёй гаспадаркі?

Бурак. З дзесяціны жыта 75-78 пуд., з ½ дзес. аўсу 45 пуд., проса з $^1/_8$ дзесяц. 12 пуд., ячменю 10 пуд., бульбы з $^3/_4$ дзес. 575 пуд. канюшыны з 1½ дзе-

сяціны 480 пуд. Азімая выка ўся ідзе на корм скаціне вясной і ўлетку. Яшчэ сэрадэлі маю 120 пуд. Усяго я маю хлеба 145 пуд., саломыазімае 200 пудоў, яравое 100 пуд.; сена, канюшыны і сэрадэлі 600 пудоў, бульбы 575 пудоў. На грошы гэта выходзіць 477 руб., але корм і бульбу я скармліваю каровамі ды прадаю масла, дык выходзіць яшчэ больш.

Старшыня. Чым вы, сьведка, дабіліся павялічэньня ўраджаю?

Бурак. Ураджай павялічыўся, калі я перашоў ад трохпалёўкі да шасьціпольля ды пачаў сеяць траву і кораньплоды; гэта дало корм скаціне, а пад скацінай стала больш гною. Апрача ўсяго я добра апрацоўваю зямлю добрымі прыладамі.

Старшыня. Колькі гною было ў вас і які быў ураджай да пераходу на травапасеў і пасьля пераходу?

Бурак. І ўспамінаць аб ураджаі да пераходу на травапасеў не хачу, проста сьмех і толькі,— жыта 35 пуд., аўсу таксама, бульбы 400 пуд., а гною, дык і 20 вазоў ня было.

Старшыня. Скажэце, сьведка, чаму вы перашлі да шматпольля, ад каго вы пра гэта даведаліся і хто вам дапамагаў?

Бурак. Да шматпольля перашоў я вось як: з трохпалёўкай жыць стала нельга; ураджаі рабіліся горш і горш, скаціна пачала драбнець. Задумаўся я тады, што рабіць, як сабе парадзіць. Пачаў пытаць у другіх, прыслухоўвацца да людзей. Ад настаўніка з нашае вёскі даведаўся я, што ёсьць нейкі агроном, які добра ведае сельскую гаспадарку. Вось да яго я і зьвярнуўся. Паведаў я яму, як кепска мы жывем і стаў прасіць, каб ён дапамог парадай. Падумаў агроном, паглядзеў на мяне ды й кажа: „добра, склікайце ў нядзелю сход, а я да вас прыеду“. Сабралі мы сход. Прыехаў і агроном і адразу стаў высьвятляць, як шкодна трохпалёўка і якую карысьць дасьць нам шматпольле з канюшынай і бульбай. Паехаў у поле, нарысаваў нам на паперы, паказаў, як патрэбна па-

дзяліць на часткі нашу зямлю, ды што на якой частцы сеяць на працягу шасьці год. Парадзіў нам зямлю перш заправіць залёным угнаеньнем—лубінам. Сказаў, як яго сеяць, дзе дастаць, як загараць насеньне і інш. Мы грамадой дасталі насеньне, пасеялі, а калі лубін падрос, тады мы яго загаралі, па ім пасеялі жыта; жыта ўрадзіла сьцяна-сьцяной; да жыта мы падсеялі сэрадэлю і калі падрасла сэрадэля, увосень мы загаралі пад бульбу, а пасьля бульбы авёс ды да яго падсеялі канюшыну; у першы год канюшына дала нам 250 пудоў з дзесяціны. Адразу скаціна ў нас павесялела. Пачалі мы больш угнойваць зямлю—павялічыліся ў нас ураджаі, і зажылі мы лепш. Цяпер я часта хаджу да хаты-чытальні, чытаю розныя кніжкі пра палепшаньне гаспадаркі, прымаю ўдзел ва ўсіх сходах і ніколі не прапушчу гутаркі з агрономам. Савецкая ўлада часта пасылае агрономаў з дакладамі ў вёскі, мы ад іх даведваемся, што і як трэба рабіць і жывем цяпер весела і сыта.

С т а р ш ы н я. Скажэце, сьведка, як вы наладзілі машыннае таварыства і якую карысьць яно вам дае?

Б у р а к. Пра магчымасьць наладзіць машыннае таварыства мы даведаліся таксама ад агронома. Ён нам запрапанаваў наладзіць таварыства. Мы сабраліся, абмеркавалі пропозыцыю і пастанавілі купіць радковую сеялку, сартоўку, малатарню, плугі. Сабралі 10 процантаў, а рэшту нам пазычылі. Цяпер мы даўно ўжо выплацілі, і машыны нашы ўласныя. А ведаеце, машыны вельмі карысныя, напрыклад, сартоўка: раней сеялі сьмецьце—сьмецьце ў нас і радзілася. Цяпер, калі чысьцім зерня, дык родзіцца чыстае жыта і лепшыя ўраджаі. Вось што значыць машыннае таварыства.

С т а р ш ы н я. Хто хоча запытаць сьведку?

Р а й г р а с. Скажэце, сьведка, апроч машыннага таварыства ёсьць у вас яшчэ таварыствы?

Б у р а к. Ёсьць малачарнае таварыства ды бычынае таварыства.

Тамасоўка. Што гэта за бычынае таварыства?

Бурак. Бычынае таварыства. А бачыце, аграном нам казаў, што калі бык будзе з добрае малочнае пароды, дык і цяляты ад яго будуць малочныя, і параіў нам стварыць бычынае таварыства. Ну, мы зноў зլажыліся дый купілі быка з малочнай пароды. І не памыліліся. Цераз тры гады мы ўжо мелі патомства куды больш малочнае, чым нашы кароўкі. Тады мы сталі падбіраць кароў на племя вельмі асьцярожна ды правільна гадаваць цялят, трымаць быдла ў цёплым хляве, даваць лепшы корм. Вось каровы й пачалі даваць больш малака. Цяпер мае каровы даюць 180 вёдзер малака, а не 50, як раней.

Старшыня *(да прокурора і абаронцы).* Ці ня маеце вы пытаньняў да сьведкі?

Прокурор. Дазвольце.

Старшыня. Калі ласка, пытайце.

Прокурор Скажэце, сьведка, куды вы дзяваеце малако, калі ў вас 4 каровы і даюць яны па 180 вёдзер малака.

Бурак. Калі пачала паляпшацца наша жывёла і ў нас зьявіліся лішкі малака, сьпярша мы ня ведалі, што з ім рабіць, бо прадаць яго было некаму. Зьвярнуліся да агронома, ён зноў дапамог: „уладжвайце“, кажа, „малачарнае таварыства“. Дапамог ён дастаць нам машыны ў пазыку, наняць хату, зլажыць умову, як гэта патрэбна па закону. Прыбыткі атрымліваем мы вельмі добрыя. Вырабляем масла і нашае масла лічыцца ў Менску амаль ня самым лепшым.

Абаронца. Дазвольце запытаць сьведку.

Старшыня. Дазваляю.

Абаронца. Скажэце, сьведка, дзе вы пасеце вашу скаціну ўлетку і як апрацоўваеце папар?

Бурак. Жывёлу ўлетку я нідзе не пасу, а сею для яе ў папары азімую выку, якая дае вельмі добры зялёны корм. На ёй я пасу жывёлу на прывязі, як гэта гаварыў агроном; я маю ³/₄ дзесяціны папару, гэта хапае для маёй скаціны да самага часу кась-

бы. Каровы заўсёды сыты і даюць многа малака. Папар ару, як раіў агроном: пасьля ўборкі выкі ў канцы мая, калі зямля яшчэ мокрая і рассыпаецца, ару глыбока і зараз-жа бараную. Цэлае лета трымаю зямлю пухкай ды чыстай ад траўя. Мяшаю тыдні за два да пасеву, каб зямля магла асесьці. Сею рана, заразжа пасьля першае прачыстае, чыстым ды здаровым насеньнем. Ураджаі ў мяне добрыя.

Старшыня. Больш пытаньняў да сьведкі ніхто ня мае?

Усе. Няма.

Старшыня. Сядайце, сьведка. *(Бурак сядае).* Агроном тав. Крывёнак. Суд просіць вас, каб вы ўгрунтавалі ўсе абвінавачваньні, якія прад'яўлены падсуднай Трохпалёўцы Беларускай у абвінавацельным акце.

Крывёнак. Першы пункт абвінавачваньня грамадзянкі Трохпалёўкі—гэта вельмі кепскае выкарыстаньне зямельнага запасу Рэспублікі, трыманьне пад папарам 1/3 ўсёй зямлі. Калі ў Рэспубліцы ёсьць шмат людзей, якіх мы павінны лічыць малазямельнымі, пакінуць у папары 1/3 частку зямлі я лічу злачынствам і вялікай стратай для сялянства. Пры правільнай апрацоўцы зямлі і чаргаваньні расьлін можна абыйсьціся і без папару, ён можа быць занятым шпаркарастучай травой, напрыклад, азімай выкай. Азімая выка дасьць корм для скаціны ў самы цяжкі час бяскорміцы, а затым звальняе зямлю для апрацоўкі. Хаця чорны нічым не заняты папар і дасьць большы ўраджай у параўнаньні з папарам, занятым выкай, але цана лішкі ўраджаю менш цаны корму для скаціны, які дае выка ў папары. Гэта пацьвярджаецца паказаньнямі сьведак Ураджая і Бурака.

Зямля, прыгодная для пасеву, можа штогодна выкарыстоўвацца. Падсудная Трохпалёўка апраўдваецца тым, што зямлі патрэбен адпачынак. Гэта правільна, але-ж які тут адпачынак, калі зямлю топча жывёла

на працягу трох альбо 4-х месяцаў; адпачынак будзе толькі тады, калі глеба застаецца рыхлаю і чыстаю ў поўным спакоі.

Другі пункт абвінавачваньня грамадзянкі Трохпалёўкі, – гэта высіленьне глебы ад пасеву расьлін аднаго роду: жыта, ячменю, аўсу, пшаніцы. Кожная расьліна патрабуе рад пажыўных матэрый; калі з іх не хапае хоць аднаго, дык расьліна жыць ня можа. Найчасьцей у зямлі не хапае чаго-небудзь з такіх трох матэрый: азоту, калія і фосфору. Расьліны бяруць гэтыя матэрыі неаднолькава, напрыклад, жыта, авёс, пшаніца, ячмень і інш. збожжа бярэ з зямлі азоту і фосфору вельмі многа; бульба, буракі бяруць з глебы многа калія, а выка, гарох, канюшына патрабуюць многа калія і нямнога фосфору, але добра абходзяцца без азоту ў глебе. Яны бяруць азот з паветра ды пераводзяць аго ў глебу, так што зямля багацее азотам. Трохпалёўка сеяла толькі хлябы. Гэтыя расьліны штогодна выцягвалі з глебы азот і фосфор, а калія многа заставалася нявыкарыстаным, прычым гэтыя спажыўныя матэрыі хлябы бяруць з паверхавых пластоў глебы. Скора ў глебе зьяўляецца перавага калія і недахват азоту. Каб выкарыстаць усе пажыўныя матэрыі з усіх пластоў глебы, расьліны павінны чаргавацца, а гэта магчыма толькі пры шматпольлі.

Трэцім абвінавачваньнем грамадзянкі Трохпалёўкі зьяўляецца выкарыстаньне папару, як пашы для скаціны, і тое, што папар позна арэцца. Раньняе ўзорваньне папару ёсьць магутны спосаб барацьбы з траўём, неўраджаем, бо яно спрыяе накапленьню спажыўных матэрый у глебе сіламі прыроды пры дапамозе паветра, вільгаці і цяпла. Раньняя апрацоўка папару ачышчае глебу ад шкоднага траўя, перашкаджае пладзіцца шкодным жуком і казюлькам, выпраўляе пабудову глебы, робіць яе з глыбакаватай (камлыгавай), пылаватай, заплываючай пры дажджох — дробна-камкаватай. Раньняя апрацоўка і ўзорваньне, як казалі сьведкі Ураджай і Бурак, павышаюць ураджай

да 100 і болей пудоў. Позьняе ўзорваньне пры трохпалёўцы псуе зямлю. За кароткі час апрацоўкі, зямля не пасьпявае сабраць многа спажыўных матэрый. Нікчэмнае траўё сушыць глебу, цягне з яе рэшту спажыўных матэрый і тады бываюць такія ўраджаі, як у сьведак Гарэлага і Нядолі—35 пуд. з дзесяціны альбо і зусім нічога ня родзіцца

Чацьверты пункт абвінавачваньня грамадзянкі Трохпалёўкі—гэта засьмечваньне ўсёй зямлі шкадлівым траўём і казюлькамі. На позным папары шкадлівыя травы пасьпяваюць узрасьці ды абсеяніцца. Будучы моцнымі і трывалымі, яны буйна разрастаюцца паміж пасевамі і глушаць хлеб, памяншаючы ўраджай. Пры шматпольлі пасевы чаргуюцца, так што зернавыя сеюцца пасьля бульбы, пад якой глеба робіцца пухлай і ачышчаецца ад траўя. Канюшына, якая сядзіць на полі па два гады і больш, таксама глушыць, нішчыць траўё. Адносна разьвядзеньня жукоў і казюлек, дык хоць грамадзянка Трохпалёўка і ня лічыць сябе вінаватай, кажучы, што не яна іх стварыла, а бог, але гэта толькі байкі, бо жукі, матылі і розныя казюлькі жывуць і могуць жыць толькі тады, калі для іх жыцьця ёсьць добрыя ўмовы. Напрыклад, матыль азімага чарвяка ў ліпені лётае і адкладвае яйкі на папары, дзе расьце траўё-сурэпка, бярозка, а таксама і на межах. Калі ў гэты час і папар і межы будуць ачышчаны ад траўя, матыль ніколі не пакіне сваіх яек, а паляціць далей шукаць травы. Пры шматпольлі папар узараны, чысты, а пры трохпольлі ён зялёны і вабіць да сябе матылёў, якія і кладуць на траве свае яйкі. З яек выходзяць чарвячкі, якія спажываюць сьпярша траўё, а пасьля пераходзяць і на пасевы. Так рабіў чарвяк соўкі-гамы (ільняны чарвяк), які ў 1922 г. паеў выку і інш. Такім чынам, у расплоджваньні жукоў зноў вінавата Трохпалёўка—яна не дае магчымасьці правільна апрацоўваць зямлю.

Пяты пункт абвінавачваньня грамадзянкі Трохпалёўкі—гэта сьвядомая адмова ад пасеву караньплодаў.

У адраджэньні сельскае гаспадаркі жывёлагадоўля мае вялізарнае значэньне. Ад жывёлагадоўлі залежыць і разьвіцьцё паляводзтва. Пры правільнай гадоўлі каровы будуць выгодна перарабляць корм, продукты ральніцтва ў дарагія продукты малочнае гаспадаркі: малако, масла, сыр. Гэта пацьвярджаецца паказаньнямі сьведак Ураджая і Бурака, якія маюць 4-6 дзесяцін зямлі, гадуюць 3—5 кароў, з якіх кожная дае 150-180 вёдзер малака і прыносіць гаспадару 400 рублёў прыбытку. Быдла-ж у сялян за бракам добрага корму дробнае, выраджаецца.

Шостае абвінавачваньне: Трохпалёўка затрымала разьвіцьцё фабрычнае прамысловасьці, што прывяло да вялікага беспрацоўя. Разьвіцьцё сельскае гаспадаркі дало-б працу шмат людзям і ўтварыла-б запатрабаваньне на вырабы прамысловасьці, якая павінна была-б разьвівацца і мацнець. Для прыкладу можна прывясьці словы сьведак Ураджая і Бурака. Як толькі зьявіліся малочныя продукты, зараз-жа для перапрацоўкі іх стварыўся маленькі завод... Я скончыў.

Старшыня. Скажэце, тав. Крывёнак, як можна падняць ураджай пры шматпольлі з травапасевам і захаваньнем усіх іншых умоў правільнага гаспадараньня?

Крывёнак. У нас на Беларусі можна атрымліваць ураджай да 150 пуд. з дзесяціны. Заграніцай пры тых самых варунках ураджаі даходзяць да 200 пуд.

Старшыня. Да якой вышыні можна давесьці малочнасьць кароў у шматпольлі з травапасевам і кораньплоднай гаспадаркай?

Крывёнак. Пры правільным выкарме і гадоўлі ў цёплых хлявох можна атрымаць 200-250 вёдзер.

Старшыня *(да сяброў, прокурора і абаронцы).* Ці ёсьць у вас запытаньні да агронома?

Прокурор. Прашу дазволіць.

Старшыня. Калі ласка.

Прокурор. Ці лічыце вы, што прычынай голаду ў СССР была грам. Трохпалёўка?

Крывёнак. Так, магу пасьведчыць, што асноўнай прычынай, затрымліваючай разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, зьяўляецца Трохпалёўка. Прычынай голаду ў Паволжы і на Украіне лічу яе.

Абаронца. Дазвольце запытаць агронома.

Старшыня. Пытайце, калі ласка.

Абаронца. Ці ня ведаеце, ёсьць прыклады пераходу да шматпольля вялікімі вёскамі ці гэта толькі робіцца ў малых вёсках і хутарох?

Крывёнак. У Маскоўскай і Яраслаўскай губэрнях цэлыя паветы перашлі на шматпольле і вельмі добра вядуць гаспадарку з павялічэньнем ліку быдла, гною і павышэньнем ураджаю.

Старшыня. Яшчэ пытаньняў да агронома ніхто ня мае?

Усе. Няма.

Старшыня. Сядайце, тав. агроном. Судовае сьледзтва абвяшчаю зачыненым. Слова мае абвінавальнік тав. Супаратар.

Прокурор. Грамадзяне судьдзі. У гэтай справе я павінен выступіць перад вамі, як прадстаўнік Савецкага ўраду і мільёнаў працуючых, якія горка пакрыўджаны падсуднай Трохпалёўкай. Дзеля гэтага я павінен падрабязна разглядзець усе злачынствы яе. Як вы чулі, грамадзянка Трохпалёўка на працягу каля 400 год трымала $^1/_3$ усёй зямлі пад папарам бяз усякай карысьці. У гэтым я бачу два злачынствы Трохпалёўкі: першае— захоп зямлі і шкадлівае яе выкарыстаньне і другое— псаваньне зямлі жывёлай і кепскае яе апрацаваньне, чым і зьмяншаецца ўраджай да 35 пудоў на дзесяціну, у той час, калі пры правільным севазвароце можна атрымаць 105-115 пудоў, а пры выкананьні ўсіх умоў, як казаў агроном, 150 пуд. Калі гэта перавесьці на грошы, дык будзе не маленькая сума. Віноўнасьць грамадзянкі Трохпалёўкі яшчэ большая ад таго, што яна, ведаючы пра малазямельле і безьзямельле сялян,

а ўсё-ж такі дарма губіла $^{1}/_{3}$ зямлі пад папарам. Апроч вялізарнага матэрыяльнага ўбытку, які яна зрабіла беларускаму народу, яна наагул шкодзіла Савецкай уладзе і СССР тым, што на Паволжы і на Украіне, якія лічацца саюзнымі жытніцамі, зрабіла бадай што пусткі, загубіла мільёны народу, згінуўшых ад голаду і пошасьці. Тут, на судзе, Трохпалёўка гаварыла, што калі зямля кепская ды ня будзе дажджу, дык ніякі агроном не дапаможа. Але-ж вы, грамадзяне судзьдзі, чулі ад сьведак Ураджая і Бурака і ад агронома, што гэта хлусьня. Сьведка Ураджай сказаў, што ў яго і яго суседзяў былі такія-ж кепскія ўраджаі, пакуль ён трымаўся трохпалёўкі, і ўраджаі павялічыліся, калі ён перашоў на шматпольле. Агроном лічыць, што Трохпалёўка вінавата і ў тэй бядзе, што здарылася на Паволжы і на Украіне. Гэта яна сушыла зямлю, гэта яна распладзіла шкоднае траўё, казюлек, жукоў, якія паелі ўраджай. Усе гэтыя злачынствы Трохпалёўкі патрабуюць кары і найгоршае кары. Наш карны кодэкс ня мае такой кары, якую заслужыла Трохпалёўка. Гэткай кары няма, бо самая найгоршая кара будзе малой для гэткай злачыннай кабеты. Вы, грамадзяне судзьдзі, павінны з коранем вырваць гэта ліха і ратаваць сялян ад гэтае агіднае злачыньніцы. Ад імя дзяржавы, ад імя працуючых я вымагаю ад вас найвышэйшае кары, я вымагаю кары сьмерці, каб Трохпалёўку Беларускую зьнішчыць.

С т а р ш ы н я. Абаронца, тав. Гаварушка, ваша слова.

Г а в а р у ш к а. Грамадзяне судзьдзі. На маю долю выпала вельмі цяжкая задача—бараніць злачыньніцу, вялізарныя злачынствы якое даведзены. Але, грамадзяне судзьдзі, няма такога злачынства, якое нельга было-б апраўдаць. Мая абарона мае мэту не ратаваць ад кары грамадзянку Трохпалёўку, а толькі аблягчыць яе долю. Грамадзянцы Трохпалёўцы каля 400 год. Яна распачала жыцьцё тады, калі зямлі было многа, а людзей мала. Гаспадарка тады вялася проста. І Трохпалёўка тады ня шкодзіла гаспадарцы, а нават ёй дапамагала.

Сяляне былі былі ўвесь час несьвядомыя, верылі забабонам і рэлігійнаму чмуту. Палепшаньне гаспадаркі залежыць ад асьветы народу. За царскія часы панаваньня капіталізму для нашага народу ня было школ, і калі жыцьцё ад паноў патрэбавала школы, яны далі сваю школу, якая адурвала народ, а не асьвячала яго. Школ сельска-гаспадарчых у нас бадай што зусім ня было. Знаёмства з іншымі спосабамі зямлякарыстаньня ў сялян ня было, хаця і сьмешна, і горка прызнацца, але народ пра іх і ня чуў. Пра траву народ толькі чуў, што ёсьць бабы-шаптухі, якія ўжываюць траўкі і зёлкі, каб лячыць скаціну, але-ж і пра гэта народ нічога добра ня ведаў, а чуў звон ды ня ведаў скуль ён. Я абараняю старую кабету, якая шмат дрэннага нарабіла, але ня ведала, што яна рабіла злачынства. Я прашу пролетарскі суд аблягчыць долю старое і прыняць пад увагу яе несьвядомасьць, цемнату і неадказнасьць у сваіх дзеях.

Старшыня. Падсудная, грамадзянка Трохпалёўка, што вы можаца сказаць суду ў сваё апраўданьне?

Трохпалёўка. Грамадзяне судзьдзі. Я ўжо старая. Я працавала, як магла, як хапала сілы. Праца мяне зрабіла гарбатай... Я лічыла, што я карысна для грамадзянства. Я ня ведала, што тое, што я раблю, ёсьць злачынства. Прашу вас, грамадзяне судзьзі, даць мне магчымасьць самой памерці...

Старшыня. Суд выходзіць на параду. *(Перарыў-10 хвілін. Судзьдзі выходзяць).*

Судовы выканаўца *(які заставаўся на сцэне).* Суд ідзе. Прашу ўстаць. *(Уваходзяць судзьдзі).*

Старшыня Імем Савецкае Соцыялістычнае Рэспублікі Беларусі, суд у складзе Старшыні Антося Высокалітоўскага, сяброў: Ігнася Лубіновіча, Сымона Сэрадэленькі, Янкі Райграса і Мікалая Тамасоўкі. . . . . 192 . . . году разгледзеў справу па абвінавачваньні грамадзянкі Трохпалёўкі ў злачынствах, якія ўтварылі вялікую шкоду сельскай гаспадарцы і

сялянам, усе злачынствы грамадзянкі Трохпалёўкі прызнаны даведзенымі і падлеглымі артыкулу карнага кодэксу і на падставе арт. 65, 171, 116, 356 таго-ж кодэксу пастанаўляе: Трохпалёўку расстраляць *(паўза 10 сэкунд)*, але ўзяўшы пад увагу яе старасьць і шчырае каяньне, суд пастанавіў паменшыць кару і замест кары сьмерці — выгнаць Трохпалёўку за межы Беларусі і СССР наогул. Пастанова канчатковая. Пасяджэньне суду лічу зачыненым.

Заслона.